На правах выгнаннікаў у калгасе знаходзіцца не толькі тая катэгорыя людзей, пра якую тут гаварылася. Да іх належаць таксама настаўнікі, выхавальнікі і нянькі дзіцячага садка, культработнікі.

— Я маю 20 сотак зямлі ля дома, а яшчэ 20 бяру ў полі, — расказвае адна кабета. — Ды не проста бяру, а выпрошваю, вымольваю іх у старшыні, бо ў калгасе не працую. То за такую "міласць" мне разам з калгасніцамі даюць дзялку буракоў. Хаджу на лён. І тым не менш за пасадку і апрацоўку сотак з мяне бяруць удвая больш, чым з тых, хто працуе ў калгасе. Не зважаюць на тое, што я ўдава, што зарплата ў мяне далёка не міністэрская.

У рэшце рэшт на сходзе вырашылі напісаць калектыўнае пісьмо ў праўленне калгаса, каб заaралі тыя няшчасныя неўрадлівыя соткі (аплата па сабекошце) і замянілі на другі ўчастак.

Калі хто-небудзь не здолее заплаціць за ворыва, то зямлю, баяцца, забяруць і другой не дадуць нідзе.

У калгасе ёсць устаноўка, што больш за 40 сотак вясковец мець не павінен. Ад такой заганнай практыкі ў многіх мясцінах Беларусі ўжо даўно адмовіліся. Ведаю, што ў маёй роднай вёсцы, якая знаходзіцца ў Мінскай вобласці, сялянам даюць зямлі нават гектар. Хаця працуй. Ды толькі ўжо браць няма каму, бо самаму малодшаму жыхару споўнілася... 72 гады. А некалі...

Абразалі прысядзібныя ўчасткі ледзь не па самыя вуглы хаты. Памятаю, калі ў вёсцы з'яўляліся землямеры з "казой", усе былі ў трывозе. Нават я, тады яшчэ зусім горкае дзіця, з хваляваннем чакала, ці прыйдуць на нашу сядзібу. У нас па другі бок вуліцы быў склеп, а пры ім — невялічкі ўчастак зямлі. І яго кожны год хацелі адабраць. Шчасце, што наша хата стаяла апошняй у вёсцы і землямеры, стаміўшыся, ахвотна сядалі за стол, які накрывала маці. Пасля добрай чаркі першаку, што заўсёды была прыгатавана ў бацькі на падобныя выпадкі, той кавалачак зямлі ля склепа ўдавалася адстаяць. А цяпер: бяры — не хачу. Ды браць ужо няма каму.

У Васілеўшчыне яшчэ ёсць каму браць. Людзі хочуць працаваць на зямлі, трымаць гаспадарку. Дык навошта ім перашкаджаць? Гэтыя людзі не працуюць у калгасе? Нічога дзіўнага. З такім старшынёй, да якога ў кабінет прасоўваюць толькі адну нагу, зможа працаваць не кожны, бо ў людзей ёсць гонар і годнасць. І з гэтым трэба лічыцца нават такому вялікаму начальніку, як Іван Канаплеўскі.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

Беларусам выдадзена 100 тысяч нямецкіх візаў

Сёлета нямецкім пасольствам беларускім грамадзянам ужо выдадзена 100 тысяч візаў. Пра гэта паведаміў намеснік дырэктара палітычнага дэпартамента федэральнага Міністэрства замежных спраў Германіі **Ульрых Брандэнбург**.

Ён прыехаў у Мінск па запрашэнні пасла ФРГ **Марціна Хекера** з нагоды адкрыцця новага візавага аддзела. У.Брандэнбург адзначыў, што паміж Беларуссю і Германіяй існуюць цесныя сувязі. Паводле яго інфармацыі, пасольства ФРГ у Беларусі займае чацвёртае месца сярод нямецкіх дыпламатычных прадстаўніцтваў па колькасці выдадзеных шэнгенскіх візаў.

Беларускіх праграмістаў не цікавіць Германія

Моцна знізілася цікавасць да атрымання "грын-карт" у Германію сярод інтэрнет-спецыялістаў, у прыватнасці, беларускіх праграмістаў. Гэта вынікае з даклада, апублікаванага германскім Дзяржаўным камітэтам працы.

Паводле звестак гэтага камітэта, у перыяд са жніўня 2000 года, калі пачалася выдача працоўных віз тыпу "грын-карт", якія дазваляюць жыць са сваёй сям'ёй і працаваць у Германіі, па студзень 2004 года было выдадзена 13.566 віз і 268 адмоўлена.

За апошнія паўтара года было зарэгістравана ўсяго 3500 заяў на нямецкую "грын-карт".

Самую вялікую групу з атрымаўшых гэтую карту складаюць індыйскія камп'ютэрныя спецыялісты (3262 чалавекі), потым ідзе група спецыялістаў з Беларусі, Расіі і Украіны (1804 чалавекі). За імі па колькасці ідуць грамадзяне Румыніі.

Марына РАХЛЕЙ.

Старыя сцены чакаюць гаспадароў

Толькі цагляныя сцены засталіся ад узведзенага сто год таму будынка Латышскай школы ў вёсцы Паташня Гарадоцкага раёна Віцебшчыны. Пасля закрыцця школы ў савецкія часы ў старых мурах пачаргова размяшчаліся бібліятэкі і пошта. Будынак не атрымаў статусу помніка гісторыі, і таму не ахоўваўся. Цяпер на яго сорамна глядзець: дах праваліўся, металічнае ацынкаванае пакрыццё мясцовыя жыхары абадралі за два дні, нават усю сталярку паразносілі па хатах.

Між тым, калі паставіцца да рэшткаў стогадовай будыніны па-гаспадарску, на яе аснове можна было б стварыць карыснае, трывалае і прыгожае памяшканне сучаснага выгляду з элементамі даўніны замест занядбаных руін. Ды толькі вось нікому гэта не патрэбна.

Падобны незайздросны лёс напаткаў апошнім часам многія цікавыя ў гістарычным плане збудаванні на Віцебшчыне. А магчымасці выратаваць іх ад канчатковага знікнення ў дзяржавы і мясцовых улад няма, бо на гэта не хапае грошай, а знайсці прыватнага ўласніка-гаспадара, які б захацеў і змог укладваць свае сродкі ў ахову і аднаўленне помнікаў, вельмі цяжка, асабліва — у сельскай мясцовасці.

— Афіцыйна ўзяць пад ахову будынак, што ўяўляе гістарычную цікавасць, нядоўга, — сцвярджае намеснік старшыні абласнога савета грамадскага аб'яднання аховы помнікаў гісторыі і культуры Ніна Сулецкая, — але гэтага недастаткова. Старадаўнім будынкам патрэбны руплівыя ўласнікі з грашыма, а пошукі такіх людзей звычайна заводзяць у тупік.

Не толькі ў аддаленых ад Віцебска мясцінах, але і ў самім абласным цэнтры можна ўбачыць варварскае стаўленне да помнікаў гісторыі і культуры. У Віцебску на кавалак сцяны Верхняга замка XIV стагоддзя цяпер, у час рэканструкцыі Кіраўскага моста, пабудаванага 50 год таму, рамонтнікі, не параіўшыся з археолагамі, пачалі класці камунікацыі. Калі гэта дапускаецца ў "культурнай сталіцы" Беларусі, то ці варта гаварыць аб тым, што адбываецца ў глыбінцы? Пад пагрозай знішчэння апынуліся рэшткі сядзіб XIX стагоддзя ў Камянполлі Міёрскага раёна, Лынтупах Пастаўскага раёна, Бачэйкаве Бешанковіцкага раёна, у Старой Беліцы Сенненскага раёна, дзе пачынаў свой працоўны шлях Янка Купала, у іншых авеяных легендамі кутках Віцебшчыны.

Людзі, гатовыя аддаць свае капіталы і намаганні дзеля захавання і адраджэння старадаўніх муроў, магчыма, знайшліся б. Але ці будзе ў іх гарантыя дзяржаўнай падтрымкі ў выглядзе льготных крэдытаў, прымальных падаткаў ды іншых неабходных крокаў насустрач з боку ўлады?

Такой гарантыі ніхто даць не можа, і таму прыгожыя і дужыя сцены, ўзведзеныя нашымі продкамі, разбураюцца часам і людзьмі, знікаюць з твару зямлі.

Але ж самае сумнае, што моладзь, якая бачыць такое нецывілізаванае стаўленне да прыкмет мінуўшчыны, прызвычайваецца да бяздушша. Многія маладыя людзі нават не задумваюцца, што ў кожнага з іх пад нагамі — наслаенні стагоддзяў і эпох, адбітак рознакаляровай вясёлкі гісторыі нашай краіны.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Журналист Василий Сарычев живет в Бресте. Но круг его интересов настолько широк, что выходит далеко за пределы Беларуси. Особенно в спортивной тематике.

Недавно состоялась презентация его книги "Миг — и судьба". Это короткие, но очень емкие сюжеты о тех, кем восхищались спортивные фанаты во второй половине XX столетия. Среди ярких имен — немало звезд белорусского спорта.

Предлагаем читателям "Народной воли" авторские строки о знаменитом футболисте минского "Динамо" Леонарде Адамове, чья судьба оказалась трагической.

Трагедия Леонарда Адамова

Странно, вычурно как-то для нашего пролетарского уха звучит это имя — Леонард, настраивая на некий самовлюбленный, надменный образ-нарцисс.

Он не был Леонардом по жизни — Валерка, Лерка, свой парень, не жалевший для команды ног, по которым нещадно били в его кинжальных налетах. С неудержимыми флангами защитники не церемонятся, при лихой манере игры многие края досрочно заканчивали карьеру по мениску. Болельщикам не забыть этого бесстрашного, бороздившего правую бровку малыша (рост 162 см), сошедшего как игрок в 29. Теперь можно догадываться о боли, которую Адамов носил в душе бесконечно долго, отведя для нее самую глубокую полочку, оставаясь для друзей открытым, компанейским Леркой, одаривавшим болельщиков яркой, самозабвенной игрой.

В жизни ему чудовищно не везло. Девчонка, которую он любил со школьной скамьи и которую привез в Минск из родных Люберец законной супругой, несколько лет спустя предпочла ему вратаря дублеров, впоследствии стоявшего в воротах киевлян, "Спартака" и первой сборной, а тогда молодого пижонистого парня, жившего, как и чета Адамовых, в Стайках. Вратаря из команды убрали, и она уехала с ним, увезя очаровательного сынишку.

Годы спустя, уже после игровой карьеры, Леонард встретил другую женщину, которой решился отдать тепло, — яркую красавицу Наталью, соседку по лестничной площадке его новой холостяцкой квартиры на Ленинском проспекте. Появившегося на свет сына назвал так же, как первого, увезенного, — Артур.

Когда после неудачного сезона-76 на смену Горянскому спасать минчан прибыла тренерская команда Олега Базилевича — "трио бандуристов", как за глаза окрестили приехавших киевлян, — из прежнего руководства почему-то оставили одного 35-летнего Адамова. Он был рабочей лошадкой, кем, впрочем, и является второй тренер: дневал и ночевал с командой на базе, тащил рутину тренерской работы. Приехавшие после увольнения из киевского "Динамо" специалист по научной части Зеленцов, начальник команды Петрашевский и старший тренер Базилевич *(в таком порядке они расположены на снимке)*, больше организаторы и мыслители, были в отличие от Адамова вольны в распоряжении своим временем. Находившиеся рядом свидетели рассказывают, что киевляне вынашивали мысль отправить Адамова на двухлетнюю учебу в столицу, по поводу чего Леонард страшно переживал, спиной чувствуя: его просто хотят удалить от жены.

За пару месяцев до страшного конца Адамову сообщили о дорожном инциденте: сотрудник ГАИ остановил мчавшуюся за город "Волгу" (полученную за бронзовый успех 1963 года), за рулем которой находилась нетрезвая Наталья. Номера машин минских динамовцев гаишники знали наизусть, и поклонник команды лишь сообщил о происшествии владельцу авто. Не умолчав о том, что на месте пассажира сидел прикомандированный к "Динамо" Зеленцов.

Леонард видел, что все опять летит кувырком, но ничего изменить не мог.

Ранним утром трагического дня 9 ноября 1977 года экспериментальная минская команда, составленная главным образом из просматриваемых игроков, должна была отправиться на товарищеские игры в Иорданию. Ночевать планировалось на базе в Стайках, откуда клубный автобус при ранних отлетах доставлял команду в аэропорт. Но Леонард Адамов, на беду, допоздна задержался в городе.

Нам не дано доподлинно знать, что он застал дома, отправившись туда вместо объявленных Стаек, намереваясь приехать утром в аэропорт своим ходом. Не имею права что-либо предполагать, хотя молва упорно связывает случившееся, а также пропажу предсмертной записки с запечатленными на снимке фигурами.

Известно лишь, что соседи слышали шум скандала, не утихавшего до глубокой ночи. Наутро Леонард Адамов отвел сынишку в детский сад, на что обратили внимание воспитательницы — в силу занятости он почти никогда этого не делал, — и долго с ним прощался.

Вернувшись домой, вскрыл себе вены, затем, словно усомнившись в правильности решения, забинтовал запястья, но в итоге все же пошел до конца. Надев синее демисезонное пальто, распахнул балконную дверь и с высоты восьмого этажа шагнул в пустоту.

Падение пришлось на козырек цветочного магазина. К приезду "скорой" в кумире болельщиков шестидесятых еще теплилась жизнь. Он умер час спустя в реанимации.

Киевские тренеры возглавляли команду еще полгода.

(По вопросам оптового приобретения книги обращаться по телефону 8-(0297)94-99-10).

СПОРТ

«Локомотив» досрочно «въехал» в высшую лигу

Минский "Локомотив" возвращается в высшую лигу национального футбольного чемпионата, откуда выбыл минувшей осенью.

В субботу железнодорожники выиграли в родных стенах у слонимского "Коммунальника" со счетом 3:1 и досрочно (за пять туров до финиша) завоевали путевку в высший дивизион. Обладатель второй путевки пока не определен.

Положение лидеров: "Локомотив" - 65, "Ведрич-97" (Речица) - 54 (24 игры), "Сморгонь" - 44, "ЗЛиН" (Гомель) - 41.

Чей состав удачнее?

Главный тренер национальной футбольной сборной Беларуси Анатолий Байдачный объявил состав на предстоящие отборочные матчи чемпионата мира 2006 года с командами Молдовы и Италии (9 и 13 октября).

Главный тренер вызвал на сбор 22 футболиста.

Вратари: Василий Хомутовский ("Стяуа" Бухарест), Александр Сулима ("Неман" Гродно), Юрий Жевнов (БАТЭ Борисов).

Защитники: Сергей Штанюк, ("Шинник" Ярославль), Дмитрий Ровнейко ("Ротор" Волгоград), Сергей Яскович (ФК "Москва"), Андрей Лаврик, ("Амкар" Пермь). Полузащитники: Сергей Гуренко ("Локомотив" Москва), Александр Кульчий ("Шинник" Ярославль), Максим Ромащенко ("Динамо" Москва), Денис Ковба ("Крылья Советов" Самара), Сергей Омельянчук ("Арсенал" Киев), Алексей Сучков ("Карпаты" Львов), Игорь Тарловский, Владимир Корытько ("Алания" Владикавказ), Денис Сащеко ("Торпедо" Жодино).

Нападающие: Виталий Булыга ("Амкар" Пермь), Геннадий Близнюк ("Сокол" Саратов), Вячеслав Глеб ("Гамбург"), Виталий Кутузов ("Сампдория" Генуя), Леонид Ковель ("Динамо" Минск).

Анатолий Николаевич вызвал на сбор и полузащитника киевского "Динамо" Валентина Белькевича, который уже "оклемался" после травмы и приступил к тренировкам в клубе.

Кстати, главный тренер сборной Италии Марчелло Липпи также объявил состав своей команды на предстоящий матч отборочного турнира чемпионата мира против сборной Беларуси, который состоится 13 октября в Палермо.

Вратари: Буффон ("Ювентус"), Пелиццоли ("Рома"); **защитники:** Бонера ("Парма"), Каннаваро ("Ювентус"), Матерацци ("Интер"), Неста ("Милан"), Панкаро ("Милан"), Оддо ("Лацио"), Дзаккардо ("Палермо"); полузащитники: Блази ("Ювентус"), Каморанези ("Ювентус"), Дзамбротта ("Ювентус"), Де Росси ("Рома"), Перротта ("Рома"), Диана ("Сампдория"), Фьоре ("Валенсия", Испания), Гаттузо ("Милан"), Корради ("Валенсия", Испания); **нападающие:** Ди Вайо ("Валенсия", Испания), Эспозито ("Кальяри"), Джилардино ("Парма"), Тони ("Палермо"), Тотти ("Рома").

Алесь СИВЫЙ.

Альберт СКАРАХОД:

«Жадаем працягнуць святкаванне!»

Не так даўно на старонках нашай газеты было надрукавана інтэрв'ю з капітанам футбольнай каманды "Арт-Старс" кампазітарам і спеваком Альбертам Скараходам.

Нагадаем, што падставай для інтэрв'ю быў дзесяцігадовы юбілей гэтай каманды.

У межах святкавання гэтай даты "Арт-Старс" згуляла матч з адміністрацыяй Фрунзенскага раёна. Сустрэча скончылася баявой нічыёй — 3:3. Але, як расказаў учора карэспандэнту "Народнай волі" Альберт Скараход, святкаванне на гэтым не скончыцца: *"Вельмі хочацца працягнуць святкаванне — усё ж такі круглая дата. Зараз шукаем саперніка. Калі ўсё будзе добра, то згуляем з камандай ветэранаў мінскага "Дынама"-1982. Я ўжо сустракаўся з Міхаілам Вяргеенкам і атрымаў яго згоду на правядзенне такой сустрэчы. Праз "Народную волю" хацелася звярнуцца да зацікаўленых людзей, якія б дапамаглі правесці гэтую сустрэчу "*

Зразумела, што пасля матча абавязкова адбудзецца канцэрт, у якім возьмуць удзел прадстаўнікі каманды "Арт-Старс".

Дарэчы, пакуль што дата правядзення паядынка не вызначана. Але, па словах Альберта Скарахода, каманда "Арт-Старс" трэніруецца ў інтэнсіўным рэжыме: *"Пад кіраўніцтвам гуляючага трэнера Дзмітрыя Даукша рыхтуемся да старту ў чэмпіянаце Мінска па міні-футболе, які павінен распачацца на будучым тыдні. Так што пакуль памянялі футбольнае поле на міні-футбольную залу. Але, каб працягнуць святкаванне свайго дзесяцігоддзя, а я на гэта спадзяюся, у хуткім часе згуляем у вялікі футбол."*

Віталь ГАРБУЗАЎ.

6
кастрычнік

СЕРАДА
Усх. 7.21 Зах. 18.34
Даўж. дня 11.13
Апошняя квадра ў 13.13

«N.R.M.» ад'язджае ў Польшчу

З 16 па 30 кастрычніка беларускі гурт дасць шэраг канцэртаў у польскіх гарадах Беласток, Вроцлаў, Кракаў, Лодзь, Варшава, Познань, Шчэцін, Хойна.

Паводле слоў лідэра "N.R.M." Лявона Вольскага, паколькі парламенцкія выбары і рэферэндум адбудуцца ў перыяд іх гастрольнага тура, музыканты плануюць узяць удзел у галасаванні на выбарчым участку, які будзе створаны ў Беластоку. Якраз напярэдадні ў Беластоку адбудзецца іх выступленне.

Павел СВЯРДЛОЎ.

Ала Клюка — лепшая

На першым Міжнародным еўраазіяцкім кінафестывалі краін СНД і Балтыі "Усход — Захад. Новае кіно. XXI стагоддзе", які завяршыўся 30 верасня ў Смаленску (Расія), беларускія кінематаграфісты заваявалі некалькі прызоў.

У конкурснай праграме форуму быў прадстаўлены мастацкі фільм "Прыкаваны" рэжысёра **Валерыя Рыбарава** сумеснай вытворчасці Беларусі і Расіі. Прыз за лепшую аператарскую работу атрымаў аператар гэтага фільма **Валерый Мюльгаўт,** уладальніцай прыза за лепшую жаночую ролю стала выканаўца галоўнай ролі ў гэтай жа карціне **Ала Клюка.**

У рамках фестывалю таксама прайшоў конкурс кароткаметражных фільмаў, у якім быў прадстаўлены дакументальны фільм "Працяг" Галіны Адамовіч. Рэжысёр атрымала дыплом "За смеласць у распрацоўцы і вырашэнні агульначалавечай тэмы".

Юлія ЦЯЛЬЦЕЎСКАЯ.

Гаўрыла ВАШЧАНКА:

«Я малюю тое, што мяне хвалюе»

— Гаўрыла Харытонавіч, нядаўна ў Гомелі адкрылася выстава "Майстар і майстры", на якой прадстаўлены вашы творы і творы дваццаці вашых вучняў. Мінчукі яе ўжо бачылі. Ад самых розных людзей я чуў станоўчыя водгукі. А як успрынялі яе землякі?

— Таксама станоўча. Не часта за межамі сталіцы можна пабачыць экспазіцыю, дзе так шырока былі б прадстаўлены напрамкі і стылі сучаснага беларускага мастацтва. А гэта якраз той выпадак. Мне даспадобы тое, што мае маладзейшыя калегі, якіх я магу лічыць сваімі вучнямі, не сталі ў сваёй творчасці капіраваць папярэднікаў, пайшлі ў мастацтве ўласным шляхам.

— А як нарадзілася ідэя такой арыгінальнай выставы?

— Сярод маіх вучняў ёсць вядомы сёння мастак Юрый Вашкевіч. Неяк ён зайшоў да мяне ў майстэрню параіцца. Юрый збіраўся ехаць ў Нямеччыну і меў клопат пра тое, як там успрымуць ягоную творчасць. Падчас нашай размовы ўзнікла думка, што някепска і беларускаму гледачу пабачыць тое, што нашы мастакі з вядомых прычын ахвотней возяць за мяжу, чым па выставачных залах сваёй краіны.

— А адкуль узялася лічба 20? У вас, наколькі я ведаю, недзе 200 вучняў. Гэта калі падсумаваць выпускнікоў кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва за той час, што вы ёю кіравалі.

— Па-першае, дзе ж такую залу знойдзеш, каб усіх сабраць. Па-другое, я хацеў бачыць сярод удзельнікаў выставы мастакоў, якія сцвердзіліся як асобы, як творцы.

— Адсюль і назва "Майстар і майстры"?

— Так. Праўда, напачатку праект насіў назву "Прафесар і вучні". Так яно было прапанавана Нацыянальнаму музею гісторыі і культуры. Але падумаўшы... Маімі вучнямі яны былі трыццаць год таму. Сёння яны ўжо самі майстры. Некаторыя зараз самі выкладаюць у акадэміі. Такім чынам, назва скарэкціравалася — "Майстар і майстры".

Крытэрыямі адбору твораў былі майстэрства і разнастайнасць. Выстава мела мэтаю сабраць тых, хто мае выразны творчы почырк і свой накірунак у мастацтве.

— У сувязі з гэтым да вас пытанне. Рыхтуючы выставу, вы мусілі зрабіць свайго роду агледзіны сучаснага мастацтва Беларусі. Як бы вы характарызавалі ягоны сённяшні стан?

— У савецкі час сітуацыя вымагала ад мастака найперш адказу на пытанне, аб чым ягоны твор, а ўжо як ён зроблены, замоўцаў цікавіла значна меней. Цяпер, на маю думку, дамінуе менавіта "як", прытым часта твор можа быць і "ні аб чым". Магчымасцяў для творчага эксперыменту відавочна пабольшала, але я не ўпэўнены, што сёння мастак больш свабодны, чым пры "сацыялістычным рэалізме". Густ замоўцы іншым разам цісне на мастака не меней чым тая ідэалагічная цэнзура.

Мастацтва, асабліва манументальнае, тады дасягала высокага ўзроўню, калі сілкавалася ад грамадскіх ідэй, памежных з рэлігіяй альбо ад рэлігіі непасрэдна. Дарэчы, ад ідэй Вялікай Французскай ці Кастрычніцкай рэвалюцый адзін крок да веры ў Абсалют. У Бога, інакш кажучы.

Я не маю настальгіі па савецкім часе, але тэзіс "Мастацтва належыць народу" мне падабаецца. Добра, калі мастаком рухае ўсведамленне, што ён працуе для грамадства, што далучаны да часосьці пазачасовага. І зусім іншая рэч, калі да жывапісу ад пачатку ставяцца як да аздобы інтэр'еру, калі карціна, як тая мэбля, робіцца на адзін сезон. На жаль, мы ўсё часцей сутыкаемся менавіта з такім разуменнем выяўленчага мастацтва. Шмат хто сёння піша карціны пад колер сцен.

— На вашым творчым шляху гэта, мабыць, не першая "перабудова" ў мастацтве?

— Так. Першай была так званая "Адліга". Самастойную творчую працу пасля заканчэння Львоўскага інстытута дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва я пачынаў у Малдове. У 1959 годзе я працаваў над аздобаю павільёна Малдаўскай ССР на ВДНГ. Памятаю, выходзім мы з калегам пасля працы з павільёна (позна ўжо было, сонца заходзіла) і аднекуль чуем нейкі грукат, гул. Непрыемны такі... Нават ніякавата стала. Потым бачым, цягнуць па асфальце зрынутую бронзавую статую Сталіна. А паколькі яна ўнутры пустая, дык кожны ўдар аддаецца, як у звоне. І неба змрочна-чырвонае. Падумалася, вось і канчаецца эпоха.

Гаўрыла Харытонавіч з жонкай.

Фота Яўгена КОКТЫША.

У Маскве я быў знаёмы з Андрэем Вазнясенскім, Яўгенам Яўтушэнкам, Бэлай Ахмадулінай. Гэтае знаёмства, праўда, нельга лічыць блізкім, а вось мастакі, якіх сёння называюць класікамі "суровага стылю", былі маімі сябрамі. Канец 50-х — пачатак 60-х гадоў — гэта быў вельмі драматычны час. Дзяржава вымушана пайшла на карэкцыю ідэалагічнай лініі. У грамадстве былі спадзяванні на вялікія перамены. Гэты стан надзеі і трывогі адлюстраваўся ў тагачасным мастацтве. Што ж датычыць сённяшняй "перабудовы" ў мастацтве, дык я параўнаў бы яе са зменаю рынкавай кан'юнктуры.

— Ад вашых маладзейшых калег я чуў меркаванні, што наша сістэма мастацкай адукацыі занадта кансерватыўная. Маўляў, трэба рыхтаваць не жывапісца, графіка альбо скульптара, а мастака ўвогуле. Такога, які пры нагодзе можа быць і тым, і другім, і трэцім. А яшчэ сцэнографам, рэжысёрам і яшчэ немаведама кім. Што вы пра гэта думаеце?

— Я мяркую, што гэтыя ідэі прыйшлі з Захаду. Прыблізна так вучаць у іхніх акадэміях. Там рыхтуюць не столькі мастака, колькі арт-менеджэра. Чалавека, які добра пачуваецца ў стыхіі рынка.

Хай мяне лічаць кансерватарам, але я ўпэўнены, што мастак пры ўсёй сваёй шматграннасці мусіць быць майстрам хоць у якой канкрэтнай справе, хоць штосьці умець рабіць дасканала. Дарэчы, тыя нашы мастакі, якія ў 20-я гады мінулага стагоддзя хто вымушана, хто самахоць з'ехалі на Захад і сцвердзілі там новую эстэтыку, мелі класічную адукацыю.

— У савецкі час адзіным замоўцам манументальнага мастацтва была дзяржава. Толькі яна магла дазволіць сабе такую раскошу. У прыватніка папросту не магло быць такіх сродкаў. А замаўляе манументальнае мастацтва сёння?

— Яшчэ калі я кіраваў у нашай акадэміі кафедрай манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, да нас прыходзілі з прапановамі супрацоўніцтва прадстаўнікі Праваслаўнай царквы. Па іх просьбе мы карэкціравалі навучальныя планы. Рабілі іншы раз па іх замове летнюю практыку, прызначалі тэмы курсавых і дыпломных работ. Але працаваць з праваслаўнымі святарамі было, памятаю, вельмі цяжка. Я нават дамогся аўдыенцыі ва ўладыкі Філарэта, каб давесці яму, што нельга заганяць мастакоў, асабліва маладых, у жорсткія рамкі канону. Уладыка адказаў мне, што гэта нават не можа быць прадметам абмеркавання, бо Праваслаўная царква моцная сваёй артадаксальнасцю. Зараз будуецца шмат цэркваў, адпаведна ёсць праца для мастакоў,— але не ўпэўнены, што ад гэтага ёсць плён нашаму мастацтву. Гэта не той выпадак, калі калькасць пераходзіць у якасць.

— Гаўрыла Харытонавіч, славу вам зрабілі сюжэтныя творы, прысвечаныя роднаму Палессю і гісторыі нашай Бацькаўшчыны. А вось апошнім часам вы ўсё часцей звяртаецеся да краявіду. Прынамсі, калі меркаваць па вашай апошняй персанальнай выставе. Як вы патлумачыце гэты канцэптуальны паварот?

— Нават не ведаю, што адказаць. Я бываю здзіўлены, калі чую ад жывапісца-станкавіста, што на сваёй персанальнай выставе ён здзейсніў нейкі "канцэптуальны праект". На палатне я нічога не праектую. Я спрабую адлюстраваць тую ці іншую думку, увасобіць той ці іншы вобраз. Я проста малюю тое, што мне цікава, што мяне хвалюе. І вельмі радуюся, калі гэта цікава і іншым.

Гутарыў Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Анатоль БАЙДАЧНЫ:

«Мясіць балота мы не хочам...»

Напярэдадні двух адборачных матчаў чэмпіянату свету 2006 года па футболе з камандамі Малдовы (у Мінску 9 кастрычніка) і Італіі (у Парме 13 кастрычніка) галоўны трэнер нашай нацыянальнай зборнай Анатоль Байдачны традыцыйна правёў прэс-канферэнцыю.

Перш-наперш журналістаў цікавіла пытанне аб магчымым альбо немагчымым удзеле ў матчах паўабаронцы кіеўскага "Дынама" Валянціна Бялькевіча, на што **Анатоль Байдачны** нявызначана адказаў: *"Валік толькі прыйшоў у сябе пасля траўмы, прыехаў на збор, аднак я і сам не ведаю, у якім фізічным стане ён зараз знаходзіцца. Пройдзе медыцынскі агляд, патрэніруецца, паглядзім... Добра будзе падрыхтаваны — выйдзе на поле, кепска будзе сябе адчуваць — самі разумееце..."*

Бліжэйшы матч з малдаванамі Анатоль Мікалаевіч папрасіў "прахадным" не называць: *"Зборная Малдовы — каманда таго ж плана, што і наша. Гэта будзе вельмі цяжкая гульня, і трэба ўжо забыць, што калісьці ў савецкія часы мы ў матчах з малдаванамі загадзя лічыліся фаварытамі. Сёння ў нас у краіне няма клуба такога ўзроўню, як малдаўскі "Шэрыф". Яны стварылі ў сябе ў рэспубліцы цудоўны спартыўны комплекс, у іх цудоўная спартыўная база — у гэтых адносінах яны пайшлі ад нас ужо вельмі далёка".*

Дарэчы, у першы дзень, калі сабралася каманда, патрэніравацца футбалісты так і не змаглі.

"Натуральна, што мы хацелі б правесці трэніроўкі на "Дынама", каб прызвычаіцца да поля, — сказаў Анатоль Мікалаевіч. — *Але поле знаходзіцца ў такім жахлівым стане, што яно больш нагадвае балота, якое мясіць няма ніякага жадання. Зараз, наколькі мне вядома, там уключылі падагрэў, а зборная патрэніруецца на іншых палях, хоць і не такой высокай якасці, як дынамаўскае".*

Застаецца дадаць толькі, што матч са зборнай Малдовы адбудзецца 9 кастрычніка ў 19.00 на мінскім стадыёне "Дынама", і білеты на яго будуць каштаваць ад 1 да 9 тысяч рублёў. Бегчы ў касы можна ўжо зараз.

Алесь СІВЫ.

Среда, 6 октября

БТ

07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12,00, 14.00, 15.00, 17.00, 18.00, 23.00 Новости.
07.05, 07.35, 08.10, 08.35 "Доброе утро, Беларусь!".
07.30, 08.30, 19.55 "Деловая жизнь".
09.05, 20.05 "Возвращение Мухтара". Сериал.
10.05 "Арсенал".
10.30 "Терион". Сериал.
11.05, 17.05 "Богатые и знаменитые". Сериал.
12.10 "Бабье царство". Драма.
13.45 Мультфильм.
14.05 "Зона Икс".
14.15 "На перекрестках Европы".
15.15 "Невероятные приключения командора Кусто". Мультсериал.
16.00 "5х5".
18.15 "Выборы-2004".
19.00 "Спасатели".
19.25 "Здоровье". Тележурнал.
21.00 "Панорама".
21.50 "Портреты современников". Видеофильм АТН.
22.00 "Бегство из опасного каньона". Приключенческий фильм.

ОНТ

07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 18.00, 20.30, 23.20 "Наши новости".
07.05 "Наше утро".
09.05, 18.55 "Клон". Сериал.
09.55, 16.30 "Фабрика звезд".
10.25, 15.40 "Дом". Реалити-шоу.
11.15 "Не только о футболе".
11.35 "Дисней-клуб".
14.50 "Женщины в любви". Сериал.
17.00 "Пять вечеров".
18.15 "Пан или пропал". Поединок с Николаем Фоменко.
20.00 "Время".
21.05 "Черный ворон". Сериал.
22.15 "72 метра". Сериал.
23.35 "Народный артист".

РОССИЯ

07.45, 19.55 "Сестры". Сериал.
08.45, 16.50 "Ундина. На гребне волны". Сериал.
09.45, 18.50 "Вести. Дежурная часть".
10.00, 16.00, 19.00 "Вести".
10.30, 19.30 "Местное время. Вести — Москва".
10.50 "Бедная Настя". Сериал.
11.50 "Что хочет женщина". Ток-шоу.
16.20 "Кулагин и партнеры". Сериал.
17.50 "Марш Турецкого". Сериал.
19.50 "Спокойной ночи, малыши!"
21.00 "Штрафбат". Сериал.
22.00 "Вести+".
22.20 "Исторические хроники".
23.15 "Эксперт".
23.25 "Американская дочь". Комедия.

ЛАД

Внимание! В связи с проведением ремонтных работ в Минском цехе УКВР (г.п.Колодищи) по Минску и Минской области проводится техническая профилактика с 09.00 до 17.00.
06.30 EURONEWS.
08.00, 14.00, 20.45 Новости.
08.10 "Мир вашему дому".
08.20 "Оркестровая яма". Ток-шоу.
09.00 "Острова".
09.40 "Люди и дельфины". Сериал.
11.00 "Женсовет".
11.15, 19.00 "Багряный первоцвет". Сериал.
12.05 "Обычный необычный день".
12.45 "Хотите — любите, хотите — нет...". Худ.фильм.
14.10 "Ностальжи".
14.35 "Кабинки "Накра". Док.фильм.
15.05 "Не зевай!".
15.15 "Бум".
15.40 Мультфильмы.
16.00 "Славянский базар в Витебске-2004". Избранное.
16.15 "Нежный возраст". Сериал.
16.40 "Из архивов БТ".
17.05 "Любите ли вы театр".
17.35 "Праздник города на "Площади искусств".
18.00 "Выборы-2004".
19.50 "Дела семейные".
20.30 "Колыбельная".
21.00 "XX век".
21.40 ("Культура") "Эпизоды".

НТВ

09.00, 12.00, 15.00, 18.00 "Сегодня".
09.15 "Преступление в стиле модерн".
09.50 "Женский взгляд".
10.20 "Растительная жизнь".
10.55, 18.40 "Граф Крестовский". Худ.фильм.
15.15 "Принцип домино".
16.25 "Каменская". Сериал.
17.35 "Чрезвычайное происшествие".
19.50 "Кодекс чести". Сериал.
21.00 "Страна и мир".
21.40 "Секс в большом городе". Сериал.
22.15 "Стресс".

СТВ+RenTV

06.30, 17.50 "Минщина. Люди, события, факты".
06.45 "Утро столицы".
07.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.50 "24 часа".
07.50, 23.15 "Технология".
08.10, 18.15 "Минск и минчане".
08.25, 20.20 "Автопанорама".
08.45 "Тема дня".
09.00 "Таракан-робот". Мультсериал.
09.25 "Аватар". Фантастический фильм.
11.10 "Закон и криминал".
11.30 "Горячий лед".
12.00 "Час суда".
13.00 "Судьбы своей хозяйка".
13.50, 18.30 "Солдаты". Сериал.
14.50 "Пауэр рейнджэрс, или Могучие рейнджеры. Потерянная галактика". Сериал.
15.15 "Рыцари-забияки". Мультсериал.
15.40 "Кот по имени Ик". Мультсериал.
16.10 Мультфильм.
16.50 "Игровой рефлекс".
17.00 "Дружная семейка". Сериал.
18.00 "Здравствуйте, доктор!".
20.05 "СТВ-спорт".
20.40 "Добрый вечер, малыш".
20.55 "Кузина Бетта". Мелодрама.
23.30 "Баскетбольная среда".
23.50 "Секретные материалы". Сериал.
00.40 "Новости СНГ".

8-Й КАНАЛ

07.00, 16.45 "Крах инженера Гарина". Сериал.
08.10, 17.50, 19.40 "Телемагазин".
08.15 "Классика Уолта Диснея". "Постреляти".
09.15 "К-игра".
09.20 "Сокровища". Док. сериал.
09.40, 19.50 "Бригада". Сериал.
10.30 "Огонь на поражение". Боевик.
16.30 "Мультпарад" от "Бюргера".
18.00 "Валентин и Валентина". Мелодрама.
19.35 "К-видео" — "Топ-8".
20.45 "Вечарніца".
21.00 "Атомик Филмз" и "К-видео" представляют...
21.05 "Без пощады". Боевик.

ТВ ЦЕНТР

04.45, 06.30 "Настроение".
07.35 "Газетный дождь".
07.45 "Разлученные убийством". Драма.
09.35 "Будьте здоровы!".
09.40 "Телемагазин".
10.00, 13.00, 17.00. 21.00 "События. Время московское".
10.15 "Дата".
11.10 "Песочные часы".
11.40 "Доходное место".
11.50 "Квадратные метры".
12.05, 23.00 "Петровка, 38".
12.25 "Деловая Москва".
13.15 "Инспектор Кресс". Сериал.
14.30 "Мода non-stop".
15.00 "Регионы: прямая речь".
15.30 "Каля-маля".
16.00 "Уголовная полиция". Сериал.
17.15 "Русский век".
18.00 "Таковы эти женщины". Сериал.
18.50 "Пять минут деловой Москвы".
18.55 "Эйс Вентура. Когда зовет природа". Комедия.
21.40 "Версты".
22.30 "Времечко".
23.20 "25-й час. События. Время московское".
23.45 "Супердиск".
00.00 "Тайны Ниро Вульфа". Детектив.
00.55 "Синий троллейбус".

EUROSPORT

09.30 Экстремальный спорт. "Молодежная зона".
10.00 Футбол. Еврголы.
11.00, 02.15 Мультиспорт. "Всякая всячина".
11.30, 17.00, 22.00 Снукер. Гран-при Великобритании.
14.00 Теннис. Турнир WTA в Германии.
19.45, 20.00 Ралли. Этап чемпионата мира в Италии.
21.00 Парусный спорт. "Под парусами".
21.30 Гольф. Европейский турнир в Ирландии.
00.45 Новости "Евроспорта".
01.00 Конный спорт. Кубок Мастерс в Канаде.
02.00 Мультиспорт по средам.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail: nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Нумар газеты аддрукаваны з дыяпазітываў заказчыка на ААТ «Красная звезда», 220073, г.Мінск, 1-ы Загарадны завулак, 3. Падпісаны ў друк у 15.00. Аб'ём 2 друк. аркушы. Тыраж: 28 210 экз. Заказ № 747.